*УДК 070.23(1-37)*

# ІНТЭРНЭТ-ПАРТАЛ У ДЫЯЛАГІЧНАЙ КАНЦЭПЦЫІ СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКІХ РАЁННЫХ ГАЗЕТ

***І. А. ІВАШКА***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Ва ўмовах лічбавізацыі традыцыйных СМІ ў беларускай медыяпрасторы заканамерна актуалізуецца парталізацыя сайтаў раённых выданняў. У сувязі з гэтым асэнсоўваецца дзейнасць 16 электронных рэсурсаў, што пазіцыянуюць сябе як парталы або маюць іх тыпалагічныя рысы. Выяўлены агульныя і ўнікальныя характарыстыкі, уласцівыя парталам сучасных беларускіх мясцовых газет.

***Ключавыя словы:*** партал; сайт; беларускія раённыя газеты; мясцовыя СМІ; прыметы парталаў.

# ИНТЕРНЕТ-ПОРТАЛ В ДИАЛОГИЧЕСКОЙ КОНЦЕПЦИИ СОВРЕМЕННЫХ БЕЛОРУССКИХ РАЙОННЫХ ГАЗЕТ

***И. О. ИВАШКО***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

В условиях цифровизации традиционных СМИ в белорусском медиапространстве закономерно актуализируется портализация сайтов районных изданий. В связи с этим осмысляется деятельность 16 электронных ресурсов, позиционирующих себя в качестве порталов или имеющих их типологические черты. Выявлены общие и уникальные характеристики, присущие порталам современных белорусских местных газет.

***Ключевые слова:*** портал; сайт; белорусские районные газеты; местные СМИ; признаки порталов.

**Образец цитирования:**
Івашка ІА. Інтэрнэт-партал у дыялагічнай канцэпцыі сучасных беларускіх раённых газет. *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика.* 2022;1:40–48.

**For citation:**
Ivashka IA. Internet portal in the dialogical concept of modern Belarusian regional newspapers. *Journal of the Belarusian State University. Journalism.* 2022;1:40–48. Belarusian.

**Автор:**
***Ирина Олеговна Ивашко*** – магистрант кафедры литературно-художественной критики факультета журналистики. Научный руководитель – кандидат филологических наук Е. В. Локтевич.

**Author:**
***Iryna A. Ivashka***, master's degree student at the department of literary-art criticism, faculty of journalism.
*ivashkoirina9@gmail.com*



CC BY NC

# INTERNET PORTAL IN THE DIALOGICAL CONCEPT OF MODERN BELARUSIAN REGIONAL NEWSPAPERS

*I. A. IVASHKA*[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

In the context of the digitalisation of traditional media in the Belarusian media space, the portalisation of the websites of regional publications is naturally actualised. In this regard, the activity of 16 electronic resources positioning themselves as portals or having their typological features is analysed. The common and unique characteristics inherent in the portals of modern Belarusian local newspapers are revealed.

***Keywords***: portal; website; Belarusian regional newspapers; local media; signs of portals.

Адной з асноўных задач дзейнасці друкаваных СМІ сёння, бясспрэчна, з'яўляецца пашырэнне чытацкай аўдыторыі і яе кансалідацыя вакол папяровай версіі і электронных рэсурсаў, дзе прадстаўлены газеты. Значнае месца ў гэтым адводзіцца інтэрнэт-журналістыцы і парталам як аднаму з яе сегментаў. Пытанні парталізацыі сайтаў газет у значнай ступені актуалізуюцца на працягу апошняга дзесяцігоддзя. Найчасцей магчымасці парталаў вывучаюцца ў ракурсе агульнанавуковых запытаў эканомікі, педагогікі, філалогіі, геаграфіі і ў сувязі са спецыфікай канструявання падобных пляцовак (М. А. Хачумаў[1]), іх выкарыстання ў адукацыйным працэсе (Я. М. Камараўцаў[2], А. М. Давыдава[3], А. Ю. Галашумаў[4]) і інтэрнэт-камунікацыі (Н. С. Грышына[5]), павышэння эфектыўнасці на вытворчасці (І. Ю. Юнін[6]) і інш. Сярод навуковых работ па разглядаемай праблеме ў галіне журналістыкі цікавасць выклікаюць працы К. А. Каракінай[7], У. А. Грабельнікава[8], А. У. Волгінай [1], Т. С. Стараверавай [2], аднак названыя намі даследаванні закранаюць праблему фрагментарна і маюць вузкую спецыялізацыю.

Неабходнасць даследавання дзейнасці парталаў беларускіх СМІ (у прыватнасці, мясцовых выданняў) і вылучэння асноўных прымет, уласцівых падобным рэсурсам, абумоўлівае актуальнасць работы. Аўтарам упершыню комплексна прааналізавана дзейнасць 16 электронных пляцовак беларускіх раённых газет (перыяд з кастрычніка па снежань 2021 г.). *Выбарку* даследавання склалі 8 сайтаў, што пазіцыянуюць сябе як парталы (на аснове аналізу сайтаў 116 мясцовых выданняў), а таксама 8 электронных пляцовак, якія маюць выражаныя тыпалагічныя прыметы парталаў (выпадковая выбарка).

Ключавым для разумення вывучаемай з'явы ў журналістыцы бачыцца размежаванне тэрмінаў «сайт» і «партал». Розніцу паміж імі тлумачаць А. А. Калмыкоў і Л. А. Коханава, якія інфармацыйным сайтам называюць сайт некамерцыйнага характару, «што ўтрымлівае вычарпальную інфармацыю па некаторай прадметнай галіне... мноства артыкулаў розных аўтараў, а таксама... апытанні, галасаванні, рассылкі»[9] [3, с. 108]. Парталам даследчыкі лічаць «буйны вэб-рэсурс, нацэлены на фарміраванне пэўнай інтэрнэт-супольнасці», які можа «аб'ядноўваць розныя сэрвісы, прадастаўляць кліентам магчымасць набываць тавары, а партнёрам абменьвацца інфармацыяй» [3, с. 109]. Супаставіць ключавыя мэтавыя і зместавыя адрозненні разглядаемых тэрмінаў дапамогуць табл. 1 і 2, складзеныя на базе высноў, зробленых А. А. Калмыковым і Л. А. Коханавай.

[1]*Хачумов М. А.* Разработка и исследование методов моделирования интернет-портала : автореф. дис. ... канд. техн. наук : 05.13.18. М., 2007. 21 с.

[2]*Комаревцев Е. М.* Образовательные порталы как средство систематизации и структурирования информации : автореф. дис. ... канд. пед. наук : 13.00.08. Ставрополь, 2004. 23 с.

[3]*Давыдова Е. М.* Модели и алгоритмы технологии обучения с использованием образовательного портала : автореф. дис. ... канд. техн. наук : 05.13.06. Томск, 2006. 20 с.

[4]*Голошумов А. Ю.* Организационно-педагогические условия использования информационных порталов в образовательном процессе вуза : автореф. дис. ... канд. пед. наук : 13.00.01. Н. Новгород, 2010. 24 с.

[5]*Гришина Н. С.* Интернет-портал «Грамота.ру» как лингвокультурологический инструмент развития культуры русской речи : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.01. М., 2008. 22 с.

[6]*Юнин И. Ю.* Модульное формирование мобильного информационного портала предприятия с целью повышения эффективности функционирования машиностроительного производства : автореф. дис. ... канд. техн. наук : 05.13.01. М., 2011. 12 с.

[7]*Карякина К. А.* Особенности журналистского и пользовательского контента в интернете : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.01.10. М., 2011. 23 с.

[8]*Грабельников В. А.* Развитие корпоративных СМИ в новой медиасреде (на примере интернет-портала) : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.01.10. М., 2012. 19 с.

[9]Тут і далей пераклад наш. – *І. І.*

Табліца 1

**Тыпалагічныя асаблівасці інфармацыйнага сайта**

Table 1

**Typological features of an information site**

| Крытэрый | Характарыстыка |
|---|---|
| Мэты | Інфармацыйная і камунікатыўная |
| Задачы | Падача вычарпальнай інфармацыі<br>Забеспячэнне запамінальнасці |
| Кантэнт | Публікацыі, інтэрактыўныя сэрвісы (апытанне, галасаванне, чат) |
| Колькасць старонак | Ад 50 |
| Тып і характарыстыка дызайну | У залежнасці ад спецыфікі інфармацыйнага напаўнення можа быць як крэатыўным, так і дзелавым |
| Сістэма навігацыі | Складаная |
| Абнаўленне | Адбываецца часта |
| Фінансавая падтрымка | Забяспечваецца банернай сістэмай |
| Асаблівасці прасоўвання | Рэкламная кампанія праводзіцца ў залежнасці ад задач заказчыка |

Табліца 2

**Тыпалагічныя асаблівасці партала**

Table 2

**Typological features of a portal**

| Крытэрый | Характарыстыка |
|---|---|
| Мэты | Камунікатыўная |
| Задачы | Няспыннае развіццё рэсурсу<br>Дадатковы заробак на прадастаўленні рэкламных месцаў іншым кампаніям |
| Кантэнт | Вялікая колькасць інфармацыі, наяўнасць службы падтрымкі, шырокі спектр паслуг (апытанне, форум, галасаванне, чат, анлайн-кансультацыі) |
| Колькасць старонак | Ад 100 |
| Тып і характарыстыка дызайну | Разнастайны (у залежнасці ад спецыфікі партала і палітыкі кампаніі) |
| Сістэма навігацыі | Складаная |
| Абнаўленне | Адбываецца па раздзелах, але сістэмна і рэгулярна |
| Фінансавая падтрымка | Забяспечваецца банернай сістэмай |
| Асаблівасці прасоўвання | Партал працуе як сістэма, што самаарганізуецца, самаразвіваецца і не патрабуе раскруткі |

Аднак нельга пагадзіцца з даследчыкамі цалкам, паколькі, на нашу думку, розніца паміж двума відамі рэсурсаў заключаецца не толькі ў эканамічнай аддачы і структурнай арганізацыі, але і ў тэхнічных магчымасцях, якія дазваляюць супрацоўнікам выдання рэалізоўваць свой творчы патэнцыял, і ў выкарыстанні новых форм падачы інфармацыі, якія ўзнікаюць з развіццём інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій і тэхнічных праграм.

Фрагментарная вывучанасць парталаў вымушае медыядаследчыкаў абапірацца на розныя тэрміналагічныя дэфініцыі. Так, на думку К. М. Каратковай, партал «забяспечвае персаніфікаваны інтэрфейс для ўзаемадзеяння карыстальнікаў, а таксама дае магчымасць знаходзіць і выкарыстоўваць дадатак [партал] і інфармацыю ў адпаведнасці з уласнымі інтарэсамі»[10]. А. В. Пуставалаў пераканаiы, што партал уяўляе сабой рэсурс, які не

[10]*Короткова Е. Н.* Медиапортал как средство создания качественного контента : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.01.10. М., 2009. С. 5.

мае друкаванай версіі [4, с. 31]. З пункту гледжання А. А. Ржанава, А. В. Карпінай і М. М. Базанавай, інфармацыйны партал – буйны, шматузроўневы вэб-сайт інфармацыйнай скіраванасці, які адрозніваецца шырынёй тэматычнага дыяпазону навінавай інфармацыі, пабудаваны вакол пошукавых сістэм і каталогаў і аб'ядноўвае разнастайныя рэсурсы і сэрвісы (курсы валют, звесткі пра надвор'е, галасаванні, апытанні, пошук, спасылкі на іншыя сайты і г. д.)[11] [5, с. 377; 6]. Найбольш універсальнай бачыцца дэфініцыя Л. К. Лабадзенкі, якая вызначае партал як «маштабны вэб-рэсурс, што накіраваны на задавальненне разнастайных інфармацыйных патрэб інтэрнэт-аўдыторыі» і можа быць пляцоўкай для размяшчэння інтэрактыўных сэрвісаў, рэкламных тэкстаў, інфармацыі пра розныя галіны грамадскай дзейнасці, мультымедыйныя тэхналогіі і г. д. [7, с. 33–34].

У медыяпрасторы Беларусі як парталы вызначаюць сябе 8 рэсурсаў раённых газет: «Родны край» (Лагойск), «Навіны Камянеччыны», «Янаўскі край» (Іванава), «Кобрынскі веснік», «Бабруйскае жыццё», «Добрушскі край», «Наш час» (Ваўкавыск) і «Палеская праўда» (Пінск). Усе парталы можна назваць адкрытымі, гарызантальнымі і інфармацыйнымі [8, с. 57], паколькі іх функцыі ахопліваюць шырокае кола карыстальнікаў [5, с. 377]. Пляцоўкі знаходзяцца на розных этапах станаўлення і маюць тры складнікі: навігацыйны (дапамога ў пошуку неабходнай інфармацыі), сэрвісны (размяшчэнне звестак пра бясплатныя інтэрнэт-паслугі) і кантэнтны (зместавае напаўненне)[12].

Пры ацэнцы парталаў мясцовых газет ключавымі прыметамі падобных рэсурсаў, на нашу думку, з'яўляюцца наяўнасць прадуманай структуры, спасылкі на іншыя інфармацыйныя рэсурсы, адзіны стыль афармлення пляцоўкі, даступныя формы ўзаемадзеяння з рэдакцыяй СМІ, рацыянальнае выкарыстанне рэкламных месцаў, зварот рэсурсаў да інтэрактыўных сэрвісаў і каталогаў паслуг, суаднесенасць дадатковых спасылак з інтарэсамі мясцовай аўдыторыі. У сувязі з гэтым выяўляецца праблема пазіцыянавання электронных рэсурсаў раённых газет, тыпалагічнае аблічча якіх складаецца з сайтаў чатырох катэгорый: парталаў з пераважнай колькасцю тыпалагічных характарыстык; пляцовак, што знаходзяцца на стадыі парталізацыі; рэсурсаў, якія пазіцыянуюцца парталамі, але маюць нязначную колькасць прымет партала; сайтаў, якія не называюць сябе парталамі, але маюць шмат прымет падобных рэсурсаў. Гэта можна патлумачыць тым, што ўсе сайты аб'ядноўваюцца зручнай навігацыяй, блочна-рубрычным змяшчэннем матэрыялаў, адзінствам знешняга выгляду пляцоўкі і наяўнасцю магчымасцей для зваротнай сувязі супрацоўнікаў электроннага рэсурсу СМІ з чытачамі.

Такім чынам, да *парталаў* можна аднесці электронныя пляцоўкі газет «Ударны фронт», «Добрушскі край», «Палеская праўда», «Навіны Камянеччыны» і «Наш час». Напрыклад, у шапцы галоўнай старонкі на інфармацыйным партале шклоўскай раённай газеты «Ударны фронт» (*shklovinfo.by*) змешчаны спасылкі на сацыяльныя сеткі і рубрыкі «Турызм», «Праект "Малая радзіма"», «Выдавецтва», «Пра нас». Рубрыка «Даведка» ўтрымлівае інфармацыю, якая звычайна ёсць на парталах: тэлефонны даведнік Шклова, звесткі пра тэлефонныя коды гарадоў Магілёўскай вобласці, расклад руху гарадскога і чыгуначнага транспарту (са спасылкамі на буйныя чыгуначныя вакзалы Беларусі) і графік прыёму грамадзян з пераходам на сайт мясцовага райвыканкама. У частцы, дзе падаецца лагатып электроннай пляцоўкі, таксама змяшчаюцца курсы валют, інфармацыя пра надвор'е і свята, якое адзначаецца ў пэўны дзень. Ніжэй знаходзяцца спасылкі на рубрыкі «Афіцыйна», «Грамадства», «Культура», «Эканоміка», «Спорт», «Здароўе», «Чалавек і закон», «Школьнае жыццё», а таксама акно «Звярнуцца ў рэдакцыю».

Ключавыя навіны падаюцца блокамі, найбольш значныя вылучаюцца большым памерам шрыфту. У рубрыцы «Свежыя навіны» прадстаўлены блочныя спасылкі (фота + загаловак) на іншыя публікацыі. З правага боку электроннай старонкі размешчаны звесткі пра падпіску або магчымасць купіць электронную версію пэўнага выпуску газеты, «Топ-навіны» і апытанне «Ці выпісваеце вы газету "Ударны фронт"?». Рубрыка «Дзе адпачыць» прадстаўлена афішай мясцовага музея і дома культуры.

Удала інтэграваны ў партал відэаспасылкі і запісы выпускаў навін «Вынікі» тэлекампаніі «Шклоў». Таксама ў зручным доступе знаходзяцца спасылкі на праекты раённага тэлебачання (рубрыкі «Ёсць меркаванне», «Ведай нашых», «Экстрым», «Маладыя спецыялісты», «Выпуск тыдня» і «Спецыяльны рэпартаж»).

Адметнасцю партала з'яўляецца магчымасць карыстальнікаў пакінуць водгук пра дзейнасць тэлекампаніі «Шклоў ТБ» (рубрыка «СМІ») і ўстаноў горада (рубрыка «Каталог арганізацый») ці напісаць каментарый. Аднак нельга не заўважыць, што падобная магчымасць ёсць толькі на асобных старонках партала (напрыклад, у рубрыцы «Фотарэпартажы»). Думаецца, што адсутнасць ці абмежаванасць каментарыяў на электронных пляцоўках рэгламентуецца Законам Рэспублікі Беларусь ад

[11] *Карпина Е. В., Базанова М. М.* Анализ специализированных СМИ [Электронный ресурс]. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/analiz-spetsializirovannyh-smi/viewer (дата обращения: 20.12.2021).

[12] *Грабельников А. В.* Развитие корпоративных СМИ в новой медиасреде (на примере интернет-портала) : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.01.10. М., 2012. С. 9–10.

17 ліпеня 2008 г. № 427-З «Аб СМІ»: у арт. 30 (п. 2.8) падкрэсліваецца, што ўладальнік інтэрнэт-рэсурсу мае права «не дапускаць размяшчэння… у сеткавым выданні інфармацыйных паведамленняў і (ці) матэрыялаў (у тым ліку каменціраванне) іншымі карыстальнікамі без іх папярэдняй ідэнтыфікацыі…». Акрамя таго, фармат аўтарызацыі, прапанаваны на пляцоўках раённых выданняў, можна патлумачыць тым, што пры ідэнтыфікацыі карыстальнікаў сайты абавязаны збіраць такія персанальныя даныя, як «прозвішча, імя, імя па бацьку, пол, дата і месца жыхарства, нумар мабільнага тэлефона і (ці) адрас электроннай пошты» (арт. 30, п. 1.3)[13].

У канцы галоўнай старонкі прадстаўлены каталог арганізацый, дзе падаюцца звесткі пра асноўныя ўстановы з розных галін жыцця раёна: ЖКГ, адукацыі, культуры, сельскай гаспадаркі і інш. Таксама праз партал газеты «Ударны фронт» чытач можа заказаць талон у медыцынскую ўстанову, даведацца расклад працы канкрэтнага работніка мясцовай цэнтральнай раённай бальніцы (сайт перанакіроўвае карыстальніка на агульнарэспубліканскі партал *Talon.by*, што значна спрашчае працэдуру заказу і замацоўвае цікавасць наведвальніка да рэсурсу).

Зваротная сувязь з журналістамі выдання не выклікае цяжкасцей, паколькі электронная пляцоўка змяшчае звесткі пра супрацоўнікаў газеты (нумары тэлефонаў, электронная пошта, адрас рэдакцыі). Таксама ў раздзеле «Кантакты» прадугледжана функцыя «Падзяліцца навінай з рэдакцыяй».

Стыль інфармацыйнага партала газеты «Навіны Камянеччыны» (*kamenec.by*) выкананы ў адзіным рашэнні (белы, чорны і чырвоны колеры, аднолькавы шрыфт і кегль для назваў рубрык). Пасля пераліку ключавых рубрык партал змяшчае анонсы ў выглядзе бягучага радка. Сярод іх можна знайсці афішу мерапрыемстваў, а таксама спецыяльныя праекты выдання: «Басанож вакол свету», «Аўтастопам з Камянца», «Камянеччына на старых фота» і «Грыбы ад вясны да зімы». Ніжэй па блоках публікуюцца галоўныя навіны. Меншыя па аб'ёме матэрыялы размяшчаюцца ў рубрыках «Фотарэпартажы», «Горача і актуальна», «Эканоміка», «Культура», «Надзвычайныя сітуацыі», «Грамадства».

З правага боку галоўнай старонкі пасля ключавых навін падаецца рэклама, рубрыкі «Апошнія навіны» і «Навіны БелТА». У раздзеле «Навігацыя» карыстальнік можа знайсці звесткі пра афармленне зваротаў у мясцовы райвыканкам, уступленне ў сілу заканадаўчых актаў, інфармацыю пра дзейнасць раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, правядзенне аўкцыёнаў. Далей падаюцца інтэрактыўныя спасылкі (адкрытыя міні-вокны) на старонкі газеты ў сацыяльных сетках *VK* і *Facebook*. Такое выкарыстанне магчымасцей электроннай пляцоўкі выдання не толькі выклікае цікавасць да яе сацыяльных сетак, але і звяртае ўвагу на найбольш папулярныя з іх.

Завяршаюць ленту звесткі пра надвор'е ў Камянцы, спасылкі на рэспубліканскія і мясцовыя рэсурсы (афіцыйныя сайты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Брэсцкага аблвыканкама, Камянецкага райвыканкама і інш.) і *Яндэкс-карта* з геалакацыяй рэдакцыі газеты «Навіны Камянеччыны». На думку А. Шміт, напаўненне сайта інфармацыяй і спасылкі на іншыя рэсурсы спалучаюцца для найбольшай зручнасці аўдыторыі, і «сэнс гэтага рашэння на інфармацыйных інтэрнэт-парталах зводзіцца да таго, каб аб'яднаць найбольшую колькасць інфармацыйных матэрыялаў і сэрвісаў, што… нязменна прыцягне ўвагу новых карыстальнікаў і чытачоў» [6, с. 101–102].

Навінавы партал газеты «Добрушскі край» (*vdobrushe.by*) вытрыманы ў адзіным стылі (светлафіялетавы карпаратыўны колер і яго адценні). У шапку галоўнай старонкі вынесена рубрыка «Апошнія навіны» (бягучы радок) і сем асноўных раздзелаў партала: рубрыкі «Галоўная», «Кантакты», «Фотагалерэя», «Рэклама», «Архіў газет», «Падпіска», «Працэдуры». Структура рэсурсу вылучаецца прадуманасцю і лагічнасцю. Пасля апошніх, ключавых матэрыялаў, што, дзякуючы інструментам вёрсткі, займаюць больш месца на галоўнай старонцы, у 15 рубрыках (у залежнасці ад тэматыкі) размяшчаюцца іншыя матэрыялы. Для зручнасці навігацыі карыстальніку прапануецца дайджэст папулярных і нядаўніх навін. З мультымедыйных фарматаў вылучаецца таймер у выглядзе лічбавага гадзінніка «Да новага года засталося…». Партал утрымлівае спасылкі на дзяржаўныя органы, БЕЛТА, МНС, тэрытарыяльныя органы мытнай службы і г. д. Акрамя таго, некаторыя публікацыі можна знайсці па тэгах, размешчаных у канцы галоўнай старонкі. Іншыя прыметы партала на рэсурсе – гэта наяўнасць прагнозу надвор'я, спасылак на негаліновыя рэсурсы і акуратныя рэкламныя блокі. Канвергенцыя з іншымі сайтамі і электроннымі старонкамі, на думку А. У. Волгінай, карысна для партала, паколькі «дазваляе эканоміць сродкі на распрацоўку ўласных праграмных прадуктаў», а карыстальнік мае магчымасць «на адной пляцоўцы атрымліваць доступ да шырокага спектра жыццёва неабходных звестак» [1, с. 93].

Шапка электроннага рэсурсу ваўкавыскай газеты «Наш час» (*volkovysknews.by*) утрымлівае руб-

[13]Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2008 г. № 427-З «О средствах массовой информации» [Электронный ресурс]. URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=h10800427 (дата обращения: 01.11.2021).

рыкі, у назвах якіх адлюстраваны асноўныя функцыі партала: «Занятасць», «Афіша», «Конкурсы», «Радыё», «Калейдаскоп», «Regional news», «Падпіска», «Рэкламадаўцам» і «Кантакты / расказаць навіну». Першая змяшчае звесткі пра актуальныя вакансіі і мерапрыемствы, звязаныя з пошукам працы. Такія пытанні вельмі актуальныя ў раёнах, таму супрацоўнікі рэдакцыі стараюцца рэгулярна абнаўляць запісы раздзела. У рубрыку «Афіша» вынесены анонсы мерапрыемстваў на тыдзень ці адзіночныя аб'явы пра найбольш значныя падзеі ў культурным ці спартыўным жыцці Ваўкавышчыны. Штомесяц у раздзеле «Конкурсы» падаецца да сямі запісаў са звесткамі пра розыгрышы прызоў ад рэдакцыі і іх выніку, у раздзеле «Радыё» – анонсы праграм і актыўнасцей мясцовай радыёстанцыі. Рубрыка «Калейдаскоп» утрымлівае сусветныя навіны. Для размяшчэння рэкламы ў выданні «Наш час» выкарыстоўваюцца плошчы ў газеце і сацсетках, а таксама партал. Па кожнай з трох пляцовак распрацаваны і аформлены асобны прайс паслуг (такую інфармацыю не знайсці на любым сайце мясцовых выданняў). Акрамя таго, у кожным блоку змешчаны кароткія відэа са статыстыкай і кантактнымі данымі, што дазваляе чытачу больш глыбока ацаніць магчымасці рэкламы на пляцоўках ваўкавыскай раёнкі. Такія адносіны рэдакцыі да рэкламнага патэнцыялу рэсурсу адлюстроўваюць думку пра тое, што адной з ключавых задач партала з'яўляецца «дадатковы заробак на прадастаўленні рэкламных месцаў» [3, с. 109].

У верхняй частцы рэсурсу падаецца лагатып выдання, спасылкі на сацыяльныя сеткі, сем асноўных навінавых рубрык, што адлюстроўваюць жыццё раёна. Таксама даступны радок пошуку. Яго размяшчэнне на невялікай адлегласці ад лагатыпа дазваляе карыстальніку хутчэй знайсці патрэбную публікацыю. У вёрстцы рэсурсу адсутнічаюць белыя плямы, месца на галоўнай старонцы размеркавана прадумана. У калонцы з правага боку галоўнай старонкі падаюцца спасылкі на архіў радыёперадач, размяшчаюцца рэкламныя звесткі, расклад транспарту, дублюецца галоўная інфармацыя з рубрык «Прамая тэлефонная лінія», «Пыталіся? Адказваем!», «Конкурсы», «Калейдаскоп». Матэрыялы, як і ў папярэдніх рэсурсах, размяшчаюцца па блоках. Навігацыя рэсурсу зразумелая і зручная.

Узорнай структурнай арганізацыяй спасылак на інфармацыйныя рэсурсы, якія не маюць непасрэднага дачынення да газеты, вылучаецца партал пінскай газеты «Палеская праўда» (*pinsknews.by*). Перад лагатыпам змешчаны раздзелы «Дзяржорганы» (спасылкі на рэсурсы рэспубліканскай вертыкалі ўлады), «Афіцыйна» (спасылкі на матэрыялы, што тычацца дзейнасці мясцовых органаў і арганізацый). Раздзел «Калейдаскоп» утрымлівае інфармацыйныя складнікі, характэрныя для парталаў: рубрыкі «Надвор'е», «Курсы [валют]», «Канвертар валют», «Кошты на паліва», «Расклад цягнікоў», «Расклад аўтобусаў», «Тэлефоны экстранных служб», «Вольны час» і «Гараскоп». Тут жа ў раздзеле «Рэдакцыя» прапануюцца спасылкі для сувязі з рэдакцыяй: «Кантакты», «Электронны зварот», «Рэкламадаўцам», «Падпіска», «Прапанаваць навіну».

Прастата навігацыі абапіраецца на каларыстычнае адзінства афармлення галоўнай старонкі рэсурсу (выканана з выкарыстаннем чорнага, белага і бірузовага колераў) і ўласціва ўсім раздзелам. У рубрыках «Навіны» і «Тэмы» матэрыялы размежаваны па галінах і ўтрымліваюць публікацыі аб ключавых падзеях у рэгіёне. Раздзел «Піншчына» прапануе чытачу інфармацыю пра гісторыю і сучаснасць горада і раёна. Катэгорыя «Папулярнае» ўяўляе сабой дайджэст найбольш чытаемых навін.

Навіны на партале размяшчаюцца блокамі па прынцыпе *выява – тэкст*. Вялікія фотаздымкі з тэкставым суправаджэннем спрашчаюць спажыванне інфармацыі, робяць яе ўспрыманне зручным. Мяркуем, такі эфект дасягнуты дзякуючы адсутнасці ў вёрстцы рэсурсу лішніх графічных элементаў.

Там жа, не сыходзячы з галоўнай старонкі рэсурсу, карыстальнік мае магчымасць падпісацца на бясплатную штодзённую *e-mail*-рассылку навін.

Некаторыя з разглядаемых пляцовак знаходзяцца ў стане *пераходу ад сайта да партала*. Такімі рэсурсамі з'яўляюцца сайты газет «Янаўскі край» (*janow.by*) і «Кобрынскі веснік» (*vkobrine.by*). Галоўная старонка інфармацыйнага партала выдання «Янаўскі край», лагатып якога не асабліва вылучаецца сярод іншых графічных і тэкставых элементаў, аформлена на белай плашцы з блакітным фонам. У ніжнім правым куце размяшчаецца акно для перапіскі з рэдакцыяй (для гэтага выкарыстоўваецца віджэт сацыяльнай сеткі *VK*). Знешні выгляд партала сведчыць пра неабходнасць удасканалення вёрсткі пляцоўкі. Галоўная навіна падаецца па прынцыпе *фота + аформлены вялікімі літарамі загаловак + частка тэксту + спасылка на поўны матэрыял (надпіс «Працягнуць»)*. Пры гэтым заўважаюцца пустыя белыя плошчы паміж галоўнай навінай і рубрыкамі, размешчанымі ніжэй. Такія ж прабелы з левага боку старонкі прысутнічаюць побач з рубрыкай «Іншыя навіны». Таксама падаюцца спасылкі на апошнія публікацыі. Такое размяшчэнне анонсаў пры падобным выкананні вёрсткі ўяўляецца лішнім.

Віджэт «Уваход на сайт» размешчаны ў сярэдзіне галоўнай старонкі, пасля блокаў рэкламы, што ўскладняе ідэнтыфікацыю карыстальніка, які хоча пакінуць каментарый на партале. Нязручным для азнаямлення сярод структурных элементаў пляцоўкі бачыцца апытанне.

Партал мае спасылкі на *YouTube*-канал ТРК «Пінск» і спасылкі-віджэты на старонкі ў сацыяль-

ных сетках *Аднакласнікі* і *VK*. У адрозненне ад віджэтаў выдання «Навіны Камянеччыны» такія адкрытыя вокны дэманструюць карыстальніку не сацыяльныя сеткі, а іх падпісчыкаў, што не ўплывае станоўча на павышэнне ўвагі аўдыторыі да суполак выдання. Інфармацыя пра заснавальніка і іншыя дзяржаўныя арганізацыі пададзена ў раздзеле «Афіцыйна». Звесткі пра расклад чыгуначнага і аўтобуснага транспарту знаходзяцца ў раздзеле «Даведачная».

Партал газеты «Янаўскі край» размяшчае аб’явы асобным раздзелам (рубрыкі «Прадаецца», «Куплю», «Праца»). Яны вылучаюцца рознымі колерамі ў залежнасці ад катэгорыі («Нерухомасць», «Транспарт» ці «Жывёлы»). Незавершанасць афармлення такой інфармацыі стварае нязручнасць для карыстальніка, паколькі аб’явы ўтрымліваюць звесткі пра тавар і кантакты прадаўца. Падобны падыход дзейсны ў газеце, а ў аб’явах аб продажы на сайце, як нам бачыцца, павінны быць змешчаны выявы тавара. Акумуляцыя чытацкіх аб’яў у адным месцы бачыцца адной з ключавых задач партала, паколькі рэдакцыя стварае прастору, у межах якой чытачы ўзаемадзейнічаюць. Такая пляцоўка фарміруе большую лаяльнасць аўдыторыі да мясцовага выдання, аб’ядноўвае вакол сябе чытачоў.

Вёрстка партала газеты «Кобрынскі веснік» сёння не адрозніваецца ад базавай вёрсткі сайтаў некаторых раённых выданняў Беларусі («Маяк Прыдняпроўя» (Быхаў), «Зара над Друццю» (Бялынічы), «Ляхавіцкі веснік», «Кліч Радзімы» (Шаркаўшчына), «Родныя вытокі» (Докшыцы) і інш.). Не зусім лагічнай бачыцца і структура рубрык пляцоўкі. Многія старонкі, характэрныя для парталаў, схаваны ўнутры іншых (напрыклад, рубрыку «Афіша» можна знайсці па алгарытме *Рубрыкі – Культура – Афіша*, рубрыку «Конкурсы» – па алгарытме *Рубрыкі – Рознае – Конкурсы* і г. д.). Верагодна, гэта звязана з пачатковай стадыяй запуску пляцоўкі і пошукам «свайго» афармлення.

Стыль партала вылучаецца з выкарыстаннем карпаратыўных колераў пляцоўкі – чорнага, шэрага і салатавага. Навіны падаюцца блокамі па рубрыках («Актуальна», «Палітыка», «Правапарадак», «Аграпрам», «Культура», «Навіны»). Да кантактных звестак вядзе спасылка «Рэдакцыя “КВ”» у галоўных рубрыках партала. Тут жа размешчаны карта з геалакацыяй рэдакцыі, інфармацыя пра орган-заснавальнік і спасылкі на нарматыўныя дакументы.

Рубрыка «Вашы прапановы» ўтрымлівае *QR*-код на групу «Кобрынскі веснік» у *Viber*, спасылкі на сацыяльныя сеткі выдання, *Telegram* і адрас электроннай пошты рэдакцыі. Ніжэй падаюцца каментарыі карыстальнікаў, апошнія з якіх датуюцца 2017 г. Думаецца, што часткова несвоечасовае абнаўленне каментарыяў уплывае на тое, што блок са зваротный сувяззю знаходзіцца пасля ўсіх запісаў. Мяркуем, не кожны чытач будзе прагортваць старонку з састарэлымі каментарыямі да канца.

Не ўсе *сайты, што пазіцыянуюць сябе парталамі*, можна адносіць да гэтай катэгорыі, улічваючы невялікую колькасць ключавых прымет (па стане на снежань 2021 г.). Такім рэсурсам з’яўляецца партал лагойскай газеты «Родны край». Так, пляцоўка (*logoysk.by*) мае просты інтэрфейс, не ўскладнены лішнімі інфармацыйнымі і графічнымі элементамі. На галоўнай старонцы сайта змешчаны лагатып невялікага памеру, кантактныя даныя, асноўныя рубрыкі, спасылкі на сацыяльныя сеткі і кнопка «Прапанаваць навіну». Матэрыялы рубрыкі «Галоўнае» падаюцца па блоках. Адна з публікацый размяшчаецца ў блоку большага памеру. На левым краі сайта даецца тэкставая спасылка на ўсе навіны. Пад рубрыкай «Галоўнае» лаканічнымі вокнамі прадстаўлены фотапраекты. Далей змешчаны блок тэкставых спасылак на рубрыку «У краіне і свеце». У кантэксце партала мясцовага выдання падобны падыход можна лічыць апраўданым, паколькі, не маючы магчымасці цалкам адмовіцца ад навін падобнай тэматыкі, газета не «перакрывае» такой інфармацыяй мясцовы кантэнт.

Таксама на сайце прапануецца дайджэст некаторых друкаваных выпускаў «Чытайце ў газеце». Пры пераходзе на яго чытач разумее галоўныя тэмы нумара, даведваецца, пра каго з жыхароў раёна расказвае выданне. Падобная форма работы ўяўляецца карыснай для чытача і з’яўляецца, на нашу думку, наватарскай у практыцы сайтаў раённых газет. Пры апраўданасці выкарыстання гэтай формы падачы інфармацыі рэдакцыі мэтазгодна абнаўляць звесткі своечасова і перыядычна: апошняе папаўненне рубрыкі адбылося ў красавіку 2021 г. Яшчэ адной адметнасцю сайта з’яўляецца прадуманая і тэхнічна аформленая пляцоўка для рэкламы.

Лента галоўнай старонкі не вельмі доўгая, што з’яўляецца яе перавагай, паколькі чытач можа хутка знайсці патрэбныя яму звесткі ў пачатку работы з парталам. Аднак, нягледзячы на структураванасць і схематычнасць у падачы матэрыяла, зручную навігацыю, незразумелым застаецца пазіцыянаванне сайта як партала. Гэта тлумачыцца тым, што рэсурс утрымлівае толькі дзве прыметы партала (дайджэст «Чытайце ў газеце» і месца для рэкламы).

Разам з тым на рынку беларускіх раённых выданняў функцыянуюць электронныя *пляцоўкі, якія не пазіцыянуюцца як парталы*, але валодаюць значнай часткай іх тыпалагічных прымет. Такімі СМІ з’яўляюцца газеты «Шахцёр», «Свіслацкая газета», «Новае жыццё», «Астравецкая праўда», «Шлях перамогі», «Адзінства», «Навіны Палесся», «Лідская газета» і інш.

Напрыклад, на сайце выдання «Лідская газета» (*lidanews.by*) ёсць прагноз надвор'я, рубрыкі «Афіша» (не запаўняецца), «Аб'явы», «Рэклама і падпіска», дайджэсты «Апошнія навіны» і «Самае чытаемае», апытанне «Што для вас галоўны фактар шчасця?». Таксама вынесены на агульны прагляд апошнія каментарыі на сайце, асобным блокам падаюцца спецыяльныя праекты, аб'явы карыстальнікаў (па катэгорыях «Дом і быт», «Электроніка», «Нерухомасць», «Будаўніцтва», "Транспарт» і інш., раздзелы «Прадам», «Шукаю», «Дару» і г. д.), актуальныя вакансіі, дайджэсты падпісчыкаў у сацыяльных сетках *VK* і *Аднакласнікі*, фота- і відэанавіны.

На электроннай пляцоўцы газеты «Шахцёр» (*shahter.by*) элементы парталаў заўважаюцца ў галоўных рубрыках – «Насельніцтву» (мае пераход на раздзелы «Прамая тэлефонная лінія», «Прыём грамадзян», «Карысная інфармацыя») і «Рэклама, аб'явы» (утрымлівае падрубрыкі «Падпіска», «Рэклама», «Прыватныя аб'явы»). Размяшчэнне аб'яў таксама аформлена па катэгорыях («Аўта-мота», «Бытавая тэхніка», «Дзіцячыя тавары», «Рознае» і інш.). Нязначную напоўненасць гэтага раздзела можна патлумачыць тым, што рэдакцыя выдання размяшчае толькі аплачаныя заяўкі. Афіша пастаянна абнаўляецца і ўтрымлівае інфармацыю ў большасці выпадкаў пра навінкі кінапраката. Ёсць на пляцоўцы таксама прагноз надвор'я. Усе віджэты гарманічна дапаўняюць галоўную старонку сайта. У канцы падаюцца спасылкі на старонкі дзяржаўных органаў і арганізацый: Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, Саюза пісьменнікаў Беларусі, народнага клуба кампазітараў «Жывіца» і інш. Асобна размешчаны фота- і відэагалерэя, рубрыкі «Конкурсы» і «Апытанні» (па стане на снежань 2021 г. не напаўняюцца інфармацыяй).

На сайце выдання «Свіслацкая газета» (*svisgaz.by*) размешчаны расклад руху транспарту, вакансіі, прагноз надвор'я, зручны пошукавы інтэрфейс, сведкі пра прамыя лініі і прыём грамадзян (рубрыка «Улада»). На пляцоўцы падаюцца спасылкі на запісы праграм раённага радыё і старонку з аб'явамі чытачоў. Пры парталізацыі сайта лагічным стане вылучэнне асобнага канала на *YouTube* пад патрэбы радыёпраграм. Каштоўнасць публікацый для карыстальнікаў вызначаюць дайджэсты «Самае цікавае» і «Самае каменціруемае» (такая ж рубрыка дзейнічае ў навагрудскім выданні «Новае жыццё»).

Сайт газеты «Новае жыццё» (*novgazeta.by*) дае магчымасць даведацца пра курсы валют, прагноз надвор'я, прачытаць гараскоп. Выданне адказна падышло да афармлення рэкламнага прайса на банерах сайта (рубрыкі «Рэкламадаўцу», «Рэклама на сайце»). Рубрыка «Заканадаўства» адпраўляе карыстальніка на старонку сайта Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, дзе змяшчаюцца дакументы, што рэгламентуюць дзейнасць СМІ і сумежных сфер. Таксама можна перайсці на сайт *tv.belta.by*, на якім размешчана электронная праграма тэлеперадач. Рубрыкі «Аб'явы» і «Праца» аформлены, але актыўна не функцыянуюць.

Такім чынам, тыповымі складнікамі парталаў на электронных рэсурсах прааналізаваных выданняў з'яўляюцца акумуляцыя сэрвісаў-дапаможнікаў (прагноз надвор'я, афіша, курсы валют ва ўсіх выданнях), выкарыстанне дайджэстаў навін («Добрушскі край», «Палеская праўда», «Свіслацкае жыццё») і мастацкіх вартасцей рэкламных пляцовак («Навіны Камянеччыны», «Добрушскі край», «Наш час», «Шахцёр», «Новае жыццё»), размяшчэнне аб'яў і інфармацыі пра вакансіі («Наш час», «Янаўскі край»), звестак пра рух транспарту («Ударны фронт»), спасылак на іншыя рэсурсы (усе разгледжаныя выданні). Радзей сустракаюцца публікацыя звестак пра прыём грамадзян і прамыя лініі з прадстаўнікамі ўлады («Ударны фронт», «Палеская праўда», «Шахцёр»), спасылкі на прававыя дакументы («Новае жыццё»), унікальныя фота- і відэаматэрыялы («Родны край», «Лідская газета») і віджэты з сацыяльнымі сеткамі («Навіны Камянеччыны», «Янаўскі край», «Лідская газета»). Разам з тым заўважна вылучаюцца характарыстыкі рэсурсаў, што прадыктаваны пошукам унікальных фарматаў функцыянавання інфармацыйных парталаў. Да іх адносяцца спасылкі на нарматыўныя і прававыя дакументы («Навіны Камянеччыны», «Кобрынскі веснік»), стварэнне анонсаў друкаваных нумароў («Родны край») або радыё- і тэлеперадач («Наш час», «Свіслацкая газета»), зручны і даступны інтэрфейс каменціравання («Лідская газета»), функцыянаванне бягучага радка («Навіны Камянеччыны», «Добрушскі край»), афармленне асобных старонак са звесткамі пра конкурсы («Наш час», «Свіслацкая газета»), размяшчэнне *Яндэкс-карт* з геалакацыямі рэдакцый («Навіны Камянеччыны», «Кобрынскі веснік»). Унікальнымі прыметамі парталаў можна лічыць магчымасць ажыццяўляць пошук патрэбнай інфармацыі па тэгах («Добрушскі край»), заказаць талоны ў медыцынскія ўстановы («Ударны фронт»), падпісацца на *e-mail*-рассылку («Палеская праўда»), у межах адной пляцоўкі атрымліваць інфармацыю пра буйныя прадпрыемствы і арганізацыі раёна, знаходзіць іх кантактныя даныя («Ударны фронт»), адлічваць час да пэўнай падзеі пасродкам таймера («Добрушскі край»), мець доступ да тэлефоннага даведніка рэгіёна («Ударны фронт»).

Мэтазгодным бачыцца вывучэнне сайтаў іншых беларускіх раённых газет, што дазволіць больш поўна прааналізаваць адметныя рысы электронных рэсурсаў і паспрыяе стварэнню тэарэтычай базы па тыпалогіі парталаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Волгина ЕВ. Уровни конвергенции региональных информационных порталов: настоящее состояние и перспективы развития. *Знак: проблемное поле медиаобразования*. 2013;1:92–94.

2. Староверова ТС. Типологические характеристики интернет-представительств региональных СМИ (на примере Республики Татарстан). *Ученые записки Казанского университета. Серия: Гуманитарные науки*. 2016;158(4):1087–1097.

3. Калмыков АА, Коханова ЛА. *Интернет-журналистика*. Москва: ЮНИТИ-ДАНА; 2005. 383 с.

4. Пустовалов АВ. Новостные порталы: структура и место на пермском интернет-рынке. *Журналистский ежегодник*. 2013;2(2):30–33.

5. Ржанов АА. Многофункциональный характер информационных порталов (на примере информационного портала Moris.ru). В: *Современные научные исследования: актуальные теории и концепции. Сборник материалов XIV Международной научно-практической конференции; 2 октября 2016 г.; Москва, Россия*. Москва: Олимп; 2016. с. 377–379.

6. Шмидт ЕВ. Интерактивный интернет-портал как инструмент информирования и организации досуга жителей мегаполиса (на примере портала «Город +»). *Труды Института бизнес-коммуникаций.* 2017;1:101–106.

7. Лободенко ЛК. Медиаконтент интернет-СМИ в информационно-коммуникационной системе региона. *Вестник Южно-Уральского государственного университета. Серия: Лингвистика*. 2015;2:33–38.

8. Грабельников АВ. Интернет-портал как новое корпоративное средство массовой информации. *Вестник Российского университета дружбы народов. Серия: Литературоведение, журналистика*. 2010;1:56–63.

## References

1. Volgina EV. Levels of convergence of regional informational portals: the present and prospect. *Znak: problemnoe pole mediaobrazovaniya*. 2013;1:92–94. Russian.

2. Staroverova TS. Typological characteristics of websites of regional mass media (by the example of the Republic of Tatarstan). *Uchenye zapiski Kazanskogo universiteta. Seriya: Gumanitarnye nauki*. 2016;158(4):1087–1097. Russian.

3. Kalmykov AA, Kokhanova LA. *Internet-zhurnalistika* [Internet-journalism]. Moscow: UNITY-DANA; 2005. 383 p. Russian.

4. Pustovalov AV. News portals: structure and place in the Perm internet market. *Zhurnalistskii ezhegodnik*. 2013;2(2): 30–33. Russian.

5. Rzhanov AA. [Multifunctional nature of information portals (using the example of an information portal Moris.ru)]. In: *Sovremennye nauchnye issledovaniya: aktual'nye teorii i kontseptsii. Materialy XIV Mezhdunarodnoi nauchno-prakticheskoi konferentsii; 2 oktyabrya 2016 g.; Moskva, Rossiya* [Modern scientific research: current theories and concepts: collection of materials of the 14th International scientific and practical conference; 2016 October 2; Moscow, Russia]. Moscow: Olimp; 2016. p. 377–379. Russian.

6. Shmidt EV. [Interactive Internet portal as a tool for informing and organising leisure activities of megalopolis residents (using the example of the portal «Gorod +»]. *Trudy Instituta biznes-kommunikatsii.* 2017;1:101–106. Russian.

7. Lobodenko LK. Online mediacontent in the information-communication system of the region. *Bulletin of the South Ural State University. Series: Linguistics*. 2015;2:33–38. Russian.

8. Grabelnikov AV. Internet portal as a new corporate mass media. *Bulletin of Peoples Friendship University of Russia. Series: Studies in Literature and Journalism*. 2010;1:56–63. Russian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 26.02.2022.*
*Received by editorial board 26.02.2022.*